Пры наяўнасьці ў БССР 57 МТС, вялізарнай колькасьці сельска-гаспадарчых машын, якімі забясьпечыла наша пралетарская дзяржава сельскую гаспадарку, пры наяўнасьці значнай колькасьці татчыковага насеньня, пры ўмовах вырасшага ўжо калгаснага актыву, мы маем вельмі спрыяючыя ўмовы для таго, каб бальшавіцкую вясну першага году другой пяцігодкі правесьці з посьпехам. Мы маем усе ўмовы, каб дабіцца павышэньня ўраджайнасьці і тавар насьці нашых калгасаў і саўгасаў, каб выканаць пастаўленую тав. Сталіным задачу—зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі.

Але для таго, каб гэту магчымасьць зрабіць сапраўднасьцю, нам трэба палепшыць сваю работу. Трэба рашучым чынам пакончыць з агульнасьцю ў кіраўніцтве, з дэкларацыйнасьцю і тэй расхлябанасьцю, якая мае месца ў нашай рабоце.

— Нашы задачы ў галіне сельскай гаспадаркі,—гаворыць у сваім дакладзе тав. Рачыцкі—выразна акрэсьлены ў дакладзе і прамове тав. Степіна на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) і ў прамове на зьлёце калгаснікаў-ударнікаў. У адпаведнасьці з гэтымі праграмнымі дакумэнтамі правадыра партыі і пастановамі ступень сакра пленуму, апошні пленум ЦК КП(б)Б вызначыў канкрэтныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой сяўбы. Задача камсамольскай арганізацыі па-бальшавіку мабілізаваць свае рады і ўсю працоўную моладзь на пасьпяховае выкананьне гэтых задач.

Тав. Рачыцкі канкрэтнымі лічбамі і фактамі характарызуе стан падрыхтоўкі да сяўбы. Асабліва дрэнна праходзіць рамонт трактараў. Плян рамонту выкананы толькі на 33 проц., прычым гэты рамонт робіцца такімі марудлівымі тэмпамі, што не гарантуе выкананьня яго ва ўстаноўлены тэрмін

Удзел камсамольцаў слабы адчуваецца ў выкананьні гэтага важнейшага участку падрыхтоўкі. Кіраўніцтва Лепельскай МТМ, дзе працуюць камсамольцы, займаецца «сэкцыянарствам». Нядаўна адтуль дасланы весткі, што адрамантаваны ўжо 11 трактараў і 40 матораў, але, калі праверылі гэту справу, дык выявілася, што адрамантаваны ўсяго толькі 3 трактары і 11 матораў. Камсамольцы, вядомы аб гэтым факце, не сыгналізавалі. Аналагічнае становішча мы маем у Сеньненскім раёне і інш.

Камсамольская арганізацыя ўзяла шэфства над доглядам каня. Па форме зроблена, як бачым шмат, а на справе ва многіх месцах камсамольцы стаяць у баку ад гэтай задачы. Характэрны такі факт. Камсамольскія арганізацыі раду раёнаў выступілі на ўсесаюзны вылет коннікаў-ударнікаў 10 чал. Усе выдуманы таварышы бязумоўна заслугоўваюць быць удзельнікамі ўсесаюзнага зьлёту. Але пры гутарцы з імі высьветлілася, што ніхто з іх ня чытаў пастановы СНК і ЦК аб падрыхтоўцы рабочай жывёлы да веснавой сяўбы.

Гэты факт ярка сьведчыць аб тым, якую ўвагу камсамольскія кіруючыя органы на месцах аддаюць каню.

У нашай сельскай гаспадарцы яшчэ вялікую ўдзельную вагу займае адна-асобны сэктар. Гэту акалічнасьць ніяк нельга ўпускаць з-пад увагі. Наша задача—забясьпечыць поўнае выкананьне пляну сяўбы і адпаведнымі гаспадарскамі. У бліжэйшыя дні трэба арганізаваць масавую праверку падрыхтаванасьці да сяўбы і сканцэнтраваць усю энэргію на неадкладную ліквідацыю недахопаў.

Першы сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Герцовіч у сваёй прамове спыніўся на недахопах у рабоце кіруючых органаў камсамольскай арганізацыі, жорстка крытыкуючы работу цэлага раду райкомаў ЛКСМБ, па-бальшавіцку паказваючы і недахопы ў рабоце самаго ЦК камсамолу.

— Прайшоў год з таго часу,—гаворыць тав. Герцовіч.—калі ЦК УсеЛКСМ прыняў пастанову аб рабоце камсамольскай арганізацыі Беларусі і аб кіраўніцтве. За гэты час мы шмат напрацавалі над выкарчоўваньнем групоўшчыны, сямейнасьці і інш. хваробаў зьявішч, якія мелі месца ў мінулым, рашуча распрацоўваючыся з тымі, хто імкнуўся цягнуць арганізацыю назад.

Працуючы пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б на чале з цьвёрдым бальшавіком, які мае багацейшы вопыт работы буйнейшых партыйных арганізацый прамысловых цэнтраў, тав. ГІКАЛО,—мы дабіліся аздаровленьня арганізацыі, бальшавіцкага згуртаваньня яе радоў на барацьбу за ажыцьцяўленьне задач партыі.

Але спадчына мінулага дае адчуваць сябе і зараз. Рэшткі групоўшчыны і сямейнасьці вырочваюць шмат узораў задрыпаных чынаўнікаў, падхалімства і інш. непрыймымых у камсамоле зьявішчаў. За прыкладамі далёка хадзіць ня трэба. Узоры чынаўніцкіх адносін да справы ва ўсім росквіце паказала кіраўніцтва Барысаўскай камсамольскай арганізацыі, што зняславіла сваю адзнаку ў пастанове ЦК ЛКСМБ.

Узоры абураючага галавацяпства, падхалімства мелі месца і ў Гомельскай арганізацыі камсамолу. Былы сакратар РК ЛКСМБ Камісарчык «працаваў» толькі мэтадамі парадных выступленьняў. Адпойчы ён зьяўляецца на заводзе імя Ленінскага, робіць там «прохарэньнную» прамову аб прамфінпляне і пад гром воплескаў уцякаецца на сваё «насяджанае» месца.

Услед за яго адходам, на сьценах заводу зьяўляюцца лёзунгі і цытаты з прамовы гэтага самага «правадыра» Камісарчыка.

— На чым аснавана такое падхалімства, калі не па нізкай сямейнасьці і групоўчыце, якая кулькуе Камісарчыка «атаманам» Гомельскай камсамольскай арганізацыі.

А вось яшчэ, бадай, больш кур'ёзны факт маніі «правадырства».

«Генэраўнаму сакратару ленінскага камсамолу моладзі Беларусі, Пуховіцкага раёну, тав. Табачніку.

Пад выпрабаваным кіраўніцтвам РК ЛКСМБ і яго непахіснага правадыра тав. Табачнікава (дасюдна), мы дабіліся вялізарнейшых посьпехаў... Плян ільнанасеньня выкананы на 63 проц., пляны на 50 і г. д.»

Аказваецца, гэты дакумэнт зарэгістраваны ўпоўнаважанымі Пуховіцкага райкомаму па заданьні тэтага самага «правадыра» Табачнікава. Гэта-ж трэба, па меншай меры, мець на шыі не талану, а качан капусты, каб дайсьці да такой нахабнасьці. Сапраўды на гэта адольны толькі такія задрыпаныя чынаўнікі, якія пралетарыяцкі сабой не работнікаў, а нікчемную пустышку, пустую гаіль.

Рапарты сыплюцца з раённых арганізацый і на імя ЦК ЛКСМБ у подобным-жа трафаретным стылі. Людзі, якія займаюцца тым, мацць на ўвазе залюбіцца, застрахавацца і разам з тым да работы адносіцца па-нігілістычнаму.

Самую бязьлітасную вайну мы абвяшчаем слэпенай дэкларацыйнасьцю «рэпартаванымі», задрыпанаму правадырству і сямейнасьці. Нам патрэбна канкрэтная дзелавая работа, бальшавіцкая скромнасьць, аўладаньне ленінскім стылем работы. Менш балбатаць, больш і лепш працаваць—вось наш лёзунг.

Опынаючыся на фактах адтвяізацыі клясава-варожых элементаў пад фальшыва-чацьцівальным сьцягам, тав. Герцовіч заваяваў увагу на задачах павышэньня клясавай пільнасьці і ўзмацненьня барацьбы супроць усялякіх наймешных праявленьняў апарцтунізму і ўхіляў у нацыянальным пытаньні. Наша работа ў прымежнай рэспубліцы патрабуе асаблівай выразнасьці і кожны крок гэтай работы павінен спалучацца з агульнымі задачамі Савецкага саюзу.

Пленум аргкамітэту ССП БССР

РАСЬЦЕ ВЯЛІКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА

25 ЛЮТАГА на РАНІШНІМ ПАСЯДЖЭНЬНІ першага лашырэнага пленуму арганізацыйнага камітэту Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў БССР з дакладамі па ТВОРЧЫХ ПЫТАНЬНЯХ савецкай літаратуры выступілі т. т. БРАНШТЭЙН і ЛІМАНОЎСКІ.

Тав. БРАНШТЭЙН свой даклад прысьвяціў, галоўным чынам, літаратуры і літаратуразнаўству з асьвятленьні кляськаў і зваснальнікаў марксызму —МАРКСА - ЭНГЕЛЬСА-ЛЕНІНА-СТАЛІНА. У аснову дакладу тав. БРАНШТЭЙНА былі пакладзены пытаньні МЭТАДАЛЕГІІ І ТВОРЧАГА МЭТАДУ савецкіх пісьменьнікаў.

Даклад т. ЛІМАНОЎСКАГА зьяўляўся фактычна працягам першага дакладу, на радзе КАНКРЭТНЫХ ФАКТАЎ з беларускай савецкай літаратуры.

Тав. Лімаеоўскі спыніўся, галоўным чынам, на разглядзе творчасьці КУЗЬМЫ ЧОРНАГА І МІХАСЯ ЗАРЭЦКАГА. Дакладчык, разглядаючы ўсе этапы ў творчасьці пісьменьніка ЧОРНАГА, асабліва раманы «СЯСТРА» і «БАЦЬКАЎШЧЫНА», указаў, што Кузьма Чорны зрабіў карэнную перабудову ў напрамку больш правільнага разуменьня нашай рэчаіснасьці, цьвёрда стаў на клясавыя пазыцыі, актыўна ўключыўся ў сацыялістычнае будаўніцтва сваім мастацкім словам.

Тав. Ліманоўскі ўказвае, што ў гэтым сэнсе ў творчасьці Кузьмы Чорнага ТРЭБА ВУЧЫЦЦА І іншым нашым пісьменьнікам, асабліва літаратурнай моладзі.

Другім пісьменьнікам, творчасьць якога была падрабязна разглядзена дакладчыкам на пленуме, зьяўляецца МІХАСЬ ЗАРЭЦКІ.

У канцы свайго дакладу т. ЛІМАНОЎСКІ ўказвае, што ўся творчасьць КУЗЬМЫ ЧОРНАГА І ІНШ. сьведчыць аб тым, што творчая перабудова нашых пісьменьнікаў шырока разгортваецца, становіцца ўсё больш і больш выразнай, нашы пісьменьнікі значна растуць узьнімаюць свой тэарытычны і агульна-культурны ўзровень, вучацца па марксыцка-ленінску разумець нашу савецкую рэчаіснасьць.

Большавіцкая самакрытыка—основа далейшага руху наперад

НА ВЯЧЭРНІМ ПАСЯДЖЭНЬНІ 25 ЛЮТАГА на пленуме шырока разгарнуліся спрэчкі па заслуханых дакладах. Выступленьні савецкіх пісьменьнікаў, асабліва делегатаў з прыфэрыі, пераканаўча паказалі, як ВЫРАСЬЛІ ЗА АПОШНІЯ ЧАСЫ КАДРЫ САВЕЦКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ, ЯК ВЫРАСЬЛІ І ЎМАЦАВАЛІСЯ САВЕЦКІЯ ЛІТАРАТАРЫ Ў БССР.

Спрэчкі праходзяць на высокім тэарытычным узроўні, пад пёўнгам разгортваньня жорсткай бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі. Дэлегаты выступаюць не «наогул», а на аснове КАНКРЭТНАГА МАТАР'ЯЛУ, аналізуючы дэталі пісьменьніцкай творчасьці, сур'ёзна крытыкуючы памылкі і зрывы. Гэты пленум, бясспрэчна, зьяўляецца ГІСТАРЫЧНЫМ ФАКТАМ для далейшага, яшчэ больш шпаркага росту савецкай літаратуры БССР. Гэты пленум узьнімае на новую больш высокую ступень РЭВАЛЮЦЫЙНУЮ КЛЯСАВУЮ ПІЛЬНАСЬЦЬ У МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ.

* * *

Т. т. САБАЛЕНКА (Гомаль), ПЯРКОЎСКІ (Клімавічы), ЛІГОЎСКІ (Віцебск) і інш. патрабавалі ад Аргкамітэту ССП ЗНАЧНА БОЛЬШАЙ УВАГІ РАБОЦЕ ПЭРЫФЭРЫЙНЫХ ФІЛІЯ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ. Гэтыя-ж таварышы на прыкладах клясава-варожых выпадкаў у сваіх раёнах паказалі, як КОНТР - РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ ВЫСТУПЛЕНЬНІ СІДАРЭНКІ, ПЕНАЧКІНА, НІКАНОВІЧА, БАРАНАВЫХ ЗНАЙШЛІ САБЕ ГАРАЧАЕ ПАДТРЫМАНЬНЕ СЯРОД РОЗНЫХ АНТЫСАВЕЦКІХ ЭЛЕМЭНТАЎ, АКТЫВІЗАВАЛІ ІХ.

Тав. САБАЛЕНКА расказаў пленуму, як у гомельскай бібліятэцы вялікарасійскія шавіністы амаль зусім пазьбіралі творы лепшых беларускіх пісьменьнікаў. Напрыклад, у БІБЛІЯТЭЦЫ ІМЯ ГЕРЦЭНА літаратура на беларускай мове складае прыблізна ТОЛЬКІ 5 проц. агульнай колькасьці кніг. Там ёсьць толькі ДЗЬВЕ КНІГІ ЯКУБА КОЛАСА, некалькі кніг ЯНКІ КУПАЛЫ, некалькі кніг ЦІШКІ ГАРТНАГА і ўсё. У гэтай бібліятэцы няма ні адной кніжкі маладых беларускіх савецкіх пісьменьнікаў.

Тав. Сабаленка патрэбаваў ад аргкамітэту ЗНАЧНА БОЛЬШАЙ УВАГІ ДА РАБОТЫ ЛІТАРАТУРНЫХ ГУРТКОЎ.

Клімавіцкая філія за апошні час вырасла да 150 чал., выдала 23 літаратурныя старонкі ў раённай газэце «Камуна». Тав. Пяркоўскі расказаў аб клясава-варожых праяўленьнях, аб кулацкіх выпадках у літаратуры.

Прыступленьне клясавай пільнасьці ў раёне,—кажа тав. ПЯРКОЎСКІ,—прывяло да таго, што былы прышчэпавец, нейкі ПАШНІКАЎ, адкрыта праводзіў шкодніцкую кулацкую работу ў зямляў парадкаванымі найбольш буйных калгасаў.

Дэлегат з Віцебскай філіі пісьменьнікаў т. ЛЮГОЎСКІ патрабуе ад аргкамітэту сыстэматычнай творчай дапамогі растучым у раёне пісьменьнікам.

Па думцы Люгоўскага, пепш было-б, каб аргкамітэт пасылаў у раёны, побач з брыгадамі, пасобных пісьменьнікаў НА БОЛЬШ ДОЎГІ ЧАС—15-20 дзён, каб таварыш мог правесьці канкрэтную творчую дапамогу мясцовым пісьменьнікам. Таксама т. Люгоўскі патрабуе ад аргкамітэту стварэньня такіх умоў, каб таварышы з раёнаў маглі друкаваць свае творы Ў ЦЭНТРАЛЬНЫХ ЧАСОПІСЯХ. Да гэтага-ж часу былі такія выпадкі, што пасланы твор у рэдакцыю якой-небудзь часопісі валяўся год—два, а потым адказвалі аўтару, што... ТВОР ЗГУБЛЕН.

ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА яшчэ пастаўлена работа па ТВОРЧЫМ ВЫХАВАНЬНІ ЎДАРНІКАЎ, ЗАКЛІКАНЫХ У ЛІТАРАТУРУ. Для того, каб гэту работу ў далейшым узьняць на належную вышыню, тав. КОРТМАН прапануе: арганізоўваць творчыя вечары выяўленых у літаратуры ўдарнікаў; арганізаваць агульна-гарадзкі семінар для творчага актыву ўдарнікаў, лепшыя творы выдаваць пасобнымі кніжкамі; абавязкова ў самыя бліжэйшыя дні дасласць у рабочыя літаратурныя гурткі праграмы, бо, напрыклад, т. АЛЯХНОВІЧ даўно ўжо атрымаў за гэтыя праграмы грошы, а праграм ўсё няма.

З вялікай прамовай выступіў ЦІШКА ГАРТНЫ. Гаворачы аб сучасным становішчы савецкай літаратуры ў БССР, тав. ГАРТНЫ ўказвае на ВЯЛІКУЮ ЎВАГУ, на ВЯЛІКІЯ КЛОПАТЫ, якія праяўляюць камуністычная партыя і савецкі ўрад да работы пісьменьнікаў. ТЫЯ АДНОСІНЫ І ДАВЕР'Е ПАРТЫІ,—падкрэсьлівае Цішка Гартны, — якія ярка выяўлены пастановай ад 23 красавіка, да нашых савецкіх пісьменьнікаў, ЁСЬЦЬ ТОЛЬКІ Ў АДЗІНАЙ КРАІНЕ, У КРАІНЕ САВЕТАЎ, У КРАІНЕ ДЫКТАТУРЫ ПРАЛЕТАРЫЯТУ. ТОЛЬКІ Ў НАС, У САВЕЦКІМ САЮЗЕ МОЖНА ПІСЬМЕНЬНІКУ ПРАЦАВАЦЬ У АКРУЖЭНЬНІ ТАКОЙ ВЯЛІКАЙ ДАПАМОГІ І ЎВАГІ.

Разам з гэтым, т. Гартны казывае імёны выдатных рэвалюцыйных пісьменьнікаў Заходняй Эўропы, якія дзіка прасьледуюцца буржуазным урэдам, кідаюцца ў турмы, жывуць у надзвычай цяжкіх матар'яльных умовах.

Канчаючы свае выступленьне, Гартны кажа: «Такіх умоў, якія стварэна наша кампартыя для работы савецкіх пісьменьнікаў, няма ні ў адной краіне. Дык давайце-ж яшчэ цяснай згуртуем ся ў магутны атрад вялікай армії рабочай класы, якой кіруе камуністычная партыя, на чале з яе правадыром тав. СТАЛІНЫМ, і будзем весьці яшчэ больш пасьпяховае змаганьне за сацыялістычнае будаўніцтва!»

Пра ДРАМАТУРГІЮ, пра РАБОТУ НАШЫХ ТЭАТРАЎ І СТАНОВІШЧА ТЭАТРАЛЬНАЙ КРЫТЫКІ гаварыў т. РЫГОР КОБЕЦ. Наша крытыка,—кажа т. Кобец,—часта апэрыце такімі тэрмінамі, такімі пагражэньнямі, якіх у большасьці не разумее і сама. Трэба разьбіроць дэталі канкрэтнага твору і на гэтым вучыць пісьменьніка, паказваць яго памылкі, адзначаць яго посьпехі ў параўнаньні з ранейшымі творамі.

Тав. КОБЕЦ кажа:

— Нельга далей нашаму аргкамітэту так сумна глядзець на нашу драматургію. Трэба прыкладаць большую ўвагу да гэтага важнага участку савецкага мастацтва. Трэба арганізоўваць творчыя вечары пасобных тэатраў, разглядаць іх новыя пастаноўкі, на гэтых разглядах вучыць і выхоўваць тэатральны капектыў і новыя драматургічныя кадры.

МІКОЛА ХВЕДАРОВІЧ гаварыў пра работу раённых філій, указаў на прыступленьне клясавай пільнасьці раду таварышоў Віцебску, Гомелю, на іх нядольнасьць своячасова зрываць маску з клясавага ворага, давяць яму жорсткі рэвалюцыйны адпор.

СЫМОН БАРАНАВЫХ, крытыкуючы свой контр-рэвалюцыйны паскевіч «МАТЧЫН СЫН» і прызнаючы свае цяжкую віну, усё-ж у адносінах сядзейнасьці надрукаванаю контр-рэвалюцыйных твораў Сідарэнкі-Пеначкіна і Нікановіча ў «БЕЛАРУСІ КАЛГАСНАЙ», спрабаваў знайсьці «аб'ектыўныя» прычыны, якія, моў, паспрыялі такой «НЕДАРЭЧНАСЬЦІ», як друкаваньне антысавецкай літаратуры.

Таксама на вячэрнім пасяджэньні 25-га лютага выступілі т. т. КАВАЛЁЎ, ШАПІРА (Дом Чырвонай арміі), АНАТОЛІ ВОЛЬНЫ, дацкачы пісьменьнік ЯНКА МАЎР і інш.

26 і 27 лютага

На вячэрніх і дзённых пасяджэньнях 26 і 27 лютага працягваліся спрэчкі. На ранішнім пасяджэньні 26-га выступілі: народны камісар асьветы БССР тав. Платун, акадэмік Замоцін, прафэсар Піятухевіч і інш. На вячэрнім пасяджэньні выступілі народны паэт Януб Колас, народны паэт Янка Купала, адказны сакратар Усесаюзнага Аргкамітэту Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў тав. Кірпотін і інш.

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЗАКУПКІ ЗБОЖЖА ЯШЧЭ НЕ АРГАНІЗАВАНЫ

План збожжазагатовак па БССР у 1932 годзе складаў толькі каля 65 проц. пляну загатовак 1931 году. Ураджай-жа збожжа ў мінулым годзе быў непараўнальна вышэй. ураджаю папярэдняга году. Ужо гэтыя два факты зьяўляюцца наглядным доказам вялікіх магчымасьцяй БССР у разгортваньні дзяржаўных закупак збожжа. У калгасах, у калгасьнікаў і адпаасобнікаў ёсьць значныя таварныя лішкі.

План дзяржаўн[illegible]упак прадугледжвае загатоў[illegible]ас. тон збожжа. Рэальнасьць яго відавочная. Аднак, у радзе раёнаў праяўляюцца настрої сумнецёку, аснаваныя на тым, што «наколькі плян не напружаны, ён будзе выкананы без асаблівых клопатаў». Такім чынам, тут паўтараюцца палітычныя памылкі, дапушчаныя ў пачатку кампаніі дзяржаўных загатовак збожжа.

— «Збожжазакупкі — не загатоўкі, — гаворыць многія работнікі загатоўчай сыстэмы і спажывецкай кааперацыі.—Закупкі павінны праводзіцца ў парадку калгаснага гандлю, і таму недапушчальна ўсякае ўмяшаньне ў гэту справу». Гэтыя размовы сьведчаць, што далёка ня ўсе загатоўчыя і кааперацыйныя работнікі зразумелі новую абстаноўку на в

На адозву зьезду адказваць ня словамі, а тонамі ссыпанага насеньня і сваячасовым і добрым рамонтам с.-г. машын

ЛЮДЗІ СЛАВЕСНА-ДЭКЛЯРАЦЫЙНЫХ, ПАНСКІ-БЮРАКРАТЫЧНЫХ МЭТАДАЎ КІРАЎНІЦТВА

АПЭРАЦЫЙНАЯ КАМІСІЯ НАРКАМЗЕМУ, ЯКАЯ... НІ РАЗУ НЯ ЗЬБІРАЛАСЯ

„Каб стаць калгасьнікамі заможнымі, для гэтага патрабуецца зараз толькі адно—працаваць у калгасе чэсна, правільна скарыстоўваць трактары і машыны, правільна скарыстоўваць рабочую скаціну, правільна апрацоўваць глебу, берагчы калгасную ўласнасьць"

(І. СТАЛІН).

Лічбы скачуць...

Зводкі Наркамзему БССР аб ссыпцы насеньня зьмяняюцца, як барометр. Лічбы літаральна скачуць.

Для прыкладу возьмем насеньне ільну. На 31 студзеня 1933 г., па зводках Наркамзему, на БССР было ссыпана 120.306 цэнтн. насеньня ільну. На 25 лютага лічыцца ссыпаным 118.089 цэнтн. ільну. За 25 дзён ніхто ня толькі павялічыць, але нават, зьмяншыць на 2.217 цэнтн.

СІРОЦІНСКІ раён, напрыклад, 31-га студзеня паведамляў, што насеньня ільну ссыпана 3.086 цэнтн., на 25 лютага гэта колькасьць ужо зьменшылася да 1.797 цэнтн.

1.280 цэнтн. насеньня ільну — выпадак у раёне культуры—нейкім чынам зьнікі.

Сіроцінскі раён не адзіны. У ВУШАЧАХ за 25 дзён колькасьць насеньня ільну таксама паменшылася на 820 цэнтн., у ДУБРОЎНЕ — на 243 цэнтн. і г. д.

У чым тут справа? На мове работнікаў сэктару ўліку Наркамзему гэта называецца ўдасканаленьнем лічбаў. На звычайнай-жа мове гэта называецца шуканьнем партыі і пралетарскай грамадзянасьці.

Аказваецца, гэтыя раёны імкнуліся толькі да таго, каб паказаць найбольшы процант. Ну, і паказалі. У насеньныя фонды залічвалі і страхавыя фонды, і культуры, ссыпаныя замест тахнічных. Зараз, калі пачалі правяраць і выявіліся шуканьне, райземаддзелы, а за імі і Наркамзем пачалі «ўдасканальваць».

На зводцы Наркамзему на 25 лютага лічыцца, што збожжавых ссыпана 99,8 проц. Як быццам, на першы погляд справа стаіць добра. Калі-ж правяраць гэту лічбу, дык аказваецца, што плян выкананы за лік меншых каштоўных культур. Напрыклад, грэчкі і ячменю ссыпана адпаведна 113 проц. і 119,1 проц., а па такіх культурах, як пшаніца — 82,6 проц., авёс — 60,9 проц. Акрамя некаторых аб'ектыўных прычын у пасобных раёнах, як недарод, мы маем тут справу з яўна сказьвецкімі тэндэнцыямі з разбазарваньнем насеньня найбольш таварных культур.

Як рэагуе на падаўныя вышэй факты Наркамзем, у прыватнасьці сэктар расьліноводзтва, які фактычна адказвае за ход ссыпкі насеньня? Загадчык сэктару тав. Кіпервалец адразу-ж імкнецца перакласьці адказнасьць за гэту справу на другіх.

— Наша справа — плянаваньне. Мы вызначаем для раёнаў планы пасеўных плошчаў і планы ссыпкі, а за ход ссыпкі павінен адказваць сэктар уліку.

Але прыпёрты да сьценкі Кіпервалец, нарэшце, ідзе на ўступкі.

— Або наш сэктар, або сэктар уліку.

На ўсе паказаныя вышэй факты сэктар расьліноводзтва зусім не рэагаваў. Наогул Кіпервалец лічыць, што рэагаваньне на падобныя факты... не датычыць Наркамзему (?!) А таму Кіпервалец можа спакойна сядзець. Неяк абыйдзецца, хто-небудзь-жа зробіць.

Для паўнаты малюнку, як Наркамзем апэрацыйна кіруе падрыхтоўкай да веснавой сяўбы, спынімся на наступным факце. 3-ці лютага за подпісам тав. Рачыцкага быў адкрыт загад аб арганізацыі пры Наркамземе апэрацыйнай пасеўнай групы ў складзе т. т. **Матуса, Еўданімава, Войцэка, Загарэльскага і Жарына.** Адказным па групе быў прызначан тав. **Матус.** Гэта група павінна была прапрацоўваць важнейшыя вузлавыя пытаньні, якія ўзьнікаюць у часе падрыхтоўкі да сяўбы, і апэрацыйна ставіць іх на вырашэньне вышэйшых партыйных і ўрадавых органаў.

Што-ж зрабіла гэта група? Літаральна нічога. Яна нават ні разу ня зьбіралася.

Ці патрэбны яшчэ факты? Здаецца, што не. І так зусім ясна, што кіраўніцтва падрыхтоўкай да сяўбы, у прыватнасьці, ссыпкай насеньня і страхавых фондаў, абменам гатунковага насеньня ў Наркамземе пакінута на самацёк.

Урокі прарываў у работе НКЗ, як відаць, нічаму яшчэ не навучылі і калегію, і апарат Наркамзему!

Зорын.

...А ШЛЯПЫ ВЕРАЦЬ

РЭЧЫЦА. (Наш кар.)

У пачатку студзеня **РЭЧЫЦКІ РАЙЗА** спусьціў у калгасы канчатковы плян веснавой сяўбы яравых.

У сувязі з гэтым загадчык райза тав. **ТАМІЛАЎ** на пасяджэньні бюро райкому КП(б)Б горача кляўся, што «пляны распрацаваны дасканальна».

— Улічаны, — заяўляў Тамілаў, — усе аб'ектыўныя і суб'ектыўныя фактары.

Тамілаву паверылі на слова...

На справе-ж пляны, спушчаныя райза, — рэдкі ўзор, скромна кажучы, галавацяпства. Паводле плянавага заданьня райза, Залатускі сельсавет, напрыклад, павінен засеяць на некалькі дзесяткаў га больш, чым ёсьць у пазяўнасьці.

Затое ў Баравікоўскім і Вішамірскім сельсаветах больш 50 проц. яравога кліну застаецца... пад папарам. Пасялескі сельсавет з 1.200 гэктараў пахаці, паводле плянаваньня райза павінен амаль 800 гэктараў таксама пакінуць пад папарам. У Засьнінскім сельсавеце з 3.082 гэкт. пахаці, на папар адводзіцца амаль 2.000 гэктараў.

А вось аднаасобнікі Вузнаўскага сельсавету, якія маюць 497 га зямлі, павінны засеяць паводле дырэктыў райза ня больш ні менш, як 700 гэкт. пад яравыя.

Калгасам Барчпоўскага сельсавету прапанавана засеяць нават... усе балоты, а аднаасобнікам — пакінуць пад папар трэцюю частку сваёй пахаці (!!!).

Ня цяжка ўбачыць, што тут прыклалі сваю руку шкодніцкія элементы. Непасрэдна складалі пляны работнікі райза — Ізотаў, Чарапові і інш. А іх шкодніцкія па сутнасьці пляны спакойна праштампаваў «пляпа» з партбілетам у кішэні—Тамілаў.

Рэчыцкі райком партыі ня турбуецца. Ён верыць Тамілаву на слова...

Д.

Мазырская арытмэтыка

МАЗЫР. (Ад нашага спэцкора).

Загадчыку **Мазырскага** райза тав. **Радзіновічу** падалі толькі што атрыманую з Менску тэлеграму. Наркамзем тэрмінова патрабаваў вестак аб ходзе рамонту сельска-гаспадарчых машын у раёне. Твар Радзіновіча адразу зьмяніў свой выраз.

Закусіўшы ніжнюю губу, упёршыся вачыма ў статыстычную зводку, Радзіновіч думаў, — што рабіць?

Зводка паказвала становішча рамонту на 25 студзеня, а тут патрабуюць вестак на 20 лютага. А трэба яшчэ дадаць, што са 150 калгасаў весткі даслалі 90. Аднаасобны сэктар у зводцы зусім не фігураваў.

Прасядзеўшы каля гадзіны над зводкамі, Радзіновіч, нарэшце, успомніў пра так званае «спрадвеч арытмэтычнае» правіла і парашыў ужыць яго ў даным выпадку. «Арытмэтыка» Радзіновіча вельмі простая. Па 90 калгасах налічвалася 1.017 неадрамантаваных плугоў, у сярэднім на кожны калгас прыпадае 11,3 плугі, значыць у астатніх 60 калгасах неадрамантавана 678 плугоў, а ўсяго па калгасным сэктары 1.685. Такім-жа чынам быў зроблен падлік і па іншых сельска-гаспадарчых машынах.

У канчатковым выніку весткі атрымалі такі выгляд: плугоў адрамантавана 47 проц., боран — 67 проц., калёс — 55 проц., сівараж — 50 проц., збруі — 28 проц. Гэта па калгасным сэктары, а па аднаасобным? Тут Радзіновіч нават нічога не падлічваў, а проста ўзяў першыя прышоўшыя на памяць лічбы.

Мы прывялі гэты факт ня толькі для таго, каб паказаць, што ў Мазырскім райза пануе хаос і неразбярыха на ўліку па ўсіх бяз выключэньня галінах падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі.

Справай рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару ў раёне фактычна ніхто ня кіруе — ні райсэкцыдзел, ні пасеўная пяцёрка. Наогул гэта пытаньне стала ў парадак дня ў раёне толькі 20 лютага на пасяджэньні пасеўнай пяцёркі. Тут-жа выявілася, што рамонт фактычна яшчэ не распачат.

У раёне ёсьць значная колькасьць кузьняў, але ні адна з іх ня ўзята на ўлік, калгасы да іх не прымацаваны. Шмат кузьняў зусім ня ўлічаны, асаб ліва ў самім раённым цэнтры. Для прыкладу возьмем кавальскую арцель «Молат». У арцелі працуе каля 50 рабочых. Загадчык арцелі заяўляе, што ён можа вылучыць ня менш 5 брыгад кавалёў для рамонту калгаснага інвэнтару, але яму аб гэтым ніхто не гаварыў. Тое-ж і з дзяржаўнымі прадпрыемствамі. Ні адно з іх ня вылучыла брыгад у дапамогу калгасам па рамонце інвэнтару.

Старшыня Мазырскага райвыканкому тав. **ЖОГАЎ** прыбушпан быў прызнацца, што рамонт с.-г. машын зусім выпусьцілі з-пад увагі.

На пленуме РВК ён заявіў:

— Занялася рамонтам трактараў, а пра плугі і забылася. Словам, з-за лесу ня прыкмецілі дроваў.

Раённы камітэт партыі таксама не пераключыўся на апэрацыйнае кіраўніцтва падрыхтоўкай да сяўбы. Упаўнаважаныя, якія-б адказвалі разам з партгрупкай і сельсаветам за прадвеснавую падрыхтоўку, на вылучаны.

У раёне, мабыць, спадзяюцца, што вясна пачакае. А пачынаецца-ж яна тут раней, чым у астатніх частках СССР

Фралоў.

Сьляпы райза

УВАРАВІЧЫ. (Наш кар.).

Стаўка на самацёк, панска-дэкляцыйныя адносіны да сваіх непасрэдных абавязкаў, — вось характэрная рыса кіраўніцтва падрыхтоўкай да веснавой кампаніі з боку Уваравіцкага райза.

Вялікая жывая справа падменена шматгаласным зводам, большасьць якіх да рэчы, зьяўляюцца дутымі.

Пасьлядні даных райза, калгасы раёну ссялі насеньня на збожжавых культурах 84 проц. пляну і на буль-ку 90 проц.

Але ўжыць гэтыя лічбы за чыстую праўду яшчэ нельга. Пасобныя калгасы дасылаюць райза яўна няправільныя, як кажуць, узятыя са столі лічбы, а райза іх спакойна штампуе.

Факты. 9 лютага праўленьне калгасу «Чырвоная ніва» паведаміла райза, што «калгас ссыпаў насеньня аўса ў памерах 43 цэнтнераў». Праз колькі хвілін-жа самы калгас паведамляе, што аўса ссыпана толькі 13,7 цэнтн. Куды-ж дзелася 34 цэнтнеры аўса? Невядома. А райза гэтыя лічбы прымае за чыстую манэту. Яго ніколькі не турбуе той факт, што ў калгасе «Чырвоная ніва» ў сапраўднасьці ідзе злачынае разбазарваньне насеньных фондаў. Праўленьне калгасу ўтаіла 14 цэнтнераў аўса, а старшыня гэтага калгасу Гарасеў разбазарыў амаль 8 цэнтнераў жыта сярод цьвердазаданьнікаў.

Кіраўнікі-ж райза толькі тое і робіць, што штампуюць весткі, якія дасылаюцца праўленьнем калгасу «Чырвоная ніва».

Гэта не адзіны факт. І ў некаторых іншых калгасах таксама ўтойваецца фактычная наяўнасьць насенных фондаў. Так, у калгасах імя Буцэнінага і «Чырвоны шлях» схавалі ў саломе дзесяткі цэнтнераў аўса. У с.-г. арцелі «Рухавік» утоена 25 цэнтнераў ячменю.

З сабатажнікамі ссыпкі насеньня, з раскрадальнікамі калгаснай маемасьці ў раёне не вядуцца рашучай і бязьлітасный барацьбы.

Раённае кіраўніцтва не мабілізавала, як сьлед, партарганізацыі на барацьбу з агентурай кулака, з буржуазнымі перарадженцамі, якія пралезьлі ў пасобныя ячэйкі.

Так сакратар парт'ячэйкі калгасу імя Энгельса — Цішчанка, замест практычнай мабілізацыі калгаснікаў на падрыхтоўку да сяўбы займаецца кулацкай агітацыяй аб тым, што «поўнасьцю ссыпаць насеньне і страхавыя фонды нішк нельга». Гэты перараджэнец ня сустрэў патрэбнага адпору, а між тым пад яго кулацкім кіраўніцтвам у калгасе імя Энгельса злачынна разбазарваецца калгасная маемасьць (раскрадзена бульба) і зрываецца ссыпка насенных фондаў.

А. К.

Марудлівыя карэктары...

У Менгарза адказным вучасткам работы — плянаваньнем — доўгі час ведаў пралезьны ў апарат клясавы вораг і шкоднік агранам **Раўда.**

Раўда добра разумеў, што плянаваньць у нашых сацыялістычнага тыпу гаспадарках адыгрывае вялізарнае значэньне. Ён верыў, што плян стымулюе павышэньне ўраджайнасьці, бо сам плян складаецца з цэлага раду агратэхнічных мерапрыемстваў. **Раўда** ведаў гэта і рабіў усё, каб ня даць магчымасьці паступова павышаць ўраджай нашых палёў. Для гэтага пляны, якія складаў **Раўда,** ня ўлічвалі асаблівасьцей кожнай буйной гаспадаркі. Раён нялікі і ў ім шмат гаспадарак. Раўда зьбірае весткі аб фактычным ураджаі з усяго раёну, падазляе іх па лік гаспадарак і выводзіць сярэднюю лічбу ўраджаю па раёну.

Выходзячы з гэтага і даецца плян па ўраджайнасьці кожнаму сельсавету. Да асобнай гаспадаркі плян Менгарза не даходзіўся.

І выходзіць так, што, калі які-небудзь калгас даў вышэйшы ўраджай, чым было ўказана ў заданьні, дык гэта лічылася выпадковасьцю. І гэты калгас у будучым не паспеш змагацца за вышэйшае ўраджайнасьці, ён ведаў магчымага.

Возьмем прыгарадны калгас імя Дзяржынскага. У 1932 годзе там капусты зьнята з га 203 цэнтн. На 1933 год калгас атрымаў ад Гарза заданьне толькі на 120 цэнтн. Буракоў было зьнята з га 167 цэнтн. Заданьне на 1933 г. дано ўсяго на 140 цэнтн. Гуркоў было зьнята 238 цэнтн., заданьне — 130 цэнтн. Кармовых коранплодаў было зьнята 250 цэнтн., заданьне дано — на 230 цэнтн.

І гэта ні ў адным толькі калгасе імя Дзяржынскага. Такая-ж самая справа па некаторых культурах і ў калгасе імя ДПУ Беларусі. Там цэлы рад культур даў падвоеную ўраджайнасьць у 1932 годзе супроць пляну. А заданьне на 1933 год калгас атрымаў нароўні з іншымі, г. зн. сярэднюю лічбу ўраджаю па раёну.

Ужо два месяцы Менгарз займаецца выпраўленьнем шкодніцкіх заданьняў Раўды, даведзеных да калгасаў.

Прыгарадныя гаспадаркі павінны хутка прыступіць да закладкі парніку. Праз месяц пачнецца сяўба рэдзькіх культур. А пляну гаспадаркі яшчэ ня маюць. Ён усё «карэктуецца» ў Менгарза. Ці не застанем там памочнікі Раўды?

М.

Справаздача дэлегата

Пакой, дзе зьмяшчаецца канцылярыя калгасу «Ленінскія ўсходы», у гэты вечар быў цалюткі запоўнен калгаснікамі. Прышлі ўсе, ня гледзячы на тое, што жывуць яшчэ ў старых хутарскіх кублах, раскіданых па полі на адлегласьці адзін ад аднаго на 3-5 клм. Прышлі, хоць з самай раніцы разьюшаны вецер без перадышкі пасьпяваў амаль да самых дахаў сьнежныя сумёты...

Сышліся калгаснікі для таго, каб паслухаць справаздачу свайго дэлегата, што прыехаў з Масквы з усесаюзнага с'езду лепшых ударнікаў сацыялістычнай вёскі.

Пасьлі хто дзе мог. Сядзелі на лаўках, на вокнах, на печы, на ляжанцы, стаялі сярод памяшканьня і цільна прыслухоўваліся да прамовы дэлегата, прагна лавілі кожнае яго слова...

А паслухаць было што. Тав. **СЬЛІЖОЎ** — дэлегат зьезду, ён-жа старшыня калгасу, трошкі хвалюючыся, пасьпешна перагортваючы свае нататкі, гаварыў:

— Толькі гэта мы, браточкі, у Маскве з вагона вылезьлі, глядзім, а вакзал паўнюткі рабочых. Са штандарамі, з лёзунгамі сустракаюць нас, вітаюць. Адчулі мы сябе, нібы дома...

— А Масква цяпер ня тая, што была гадоў дзесяць назад. Фабрык, заводаў колькі новых, камбінат, — паглядзіш аж шапка валіцца. А работа як наладжана! Хадзілі гэта мы на завод імя т. Сталіна. Аўтамабілі там вырабляюцца. Праз кожныя 7 мінут —новенькі грузавік.

— А клюбы якія, сталоўкі, кіно!.. Многаму, адным словам, у іх нам трэба павучыцца.

— Дысцыпліна, напрыклад, — падкрэсьлівае тав. Сьлижоў, — на маскоўскіх заводах пастаўлена — во!.. За адзін злосны прагул — з работы зьмятаюць. І закон гэты самі рабочыя прапанавалі. Ня тое, што бывае ў нас: захота — ідзе на работу, а ня хоча — сьпіць. І сам не працуе і іншым перашкаджае. А чаму? Ды таму, што мы яшчэ свае капчысы ад кулацкай заразы поўнасьцю не ачысьцілі.

Зьезд заклікаў нас, калгаснікаў, дабіць кулака. А які зьезд быў — ня жартачкі, вялікая сіла...

— І вось, калі мы возьмемся дружна, ды ачысьцім нашы калгасы ад кулака, гультая ды жуліка, калі мы правядзем ударны сяўбу і паняўчым наш ураджай, — тады і дзяржаву хлебам засыпем і самі, як казаў тав. Сталін, **ЗАМОЖНА БУДЗЕМ ЖЫЦЬ.**

— Усяго я вам, таварышы, аднак, за адзін вечар ня здолею расказаць. Лепш давайце запытаньні.

Сход жвава адгукнуўся на просьбу дэлегата. Пасыпаліся заўвагі, запытаньні, разгарнуліся спрэчкі.

— А гэта правільна, што работу на сем разрадаў падзялілі. Крыўдна ня будзе, працаваць будзем в большай ахвотай. А то, бывала, адзін па двара цэлы дзень пільнуе, а другі ад сонца да сонца косіць, а вечарам — слава адна: «палку» аднолькавую ставяць...

— Што і гаварыць, — даволі падказцца з гультаямі. Хіба-ж можна цярпець такое, як гэта, скажам, зрабіў Машненка, Ільля каторы: даручылі яму працаваць адзін дзень ля каровы, а ён, як даведаўся, што ваду давядзецца вазіць, дык і кажа: «Холадно, не пайду».

— Ну добра, — скрабе патылічку стары калгаснік, — гультай гультаямі... Але як-жа выкрыць кулацкую работу? Як выявіць кулака?..

Завязаліся гарачыя спрэчкі. Урэшце, адзін з прысутных бяро слова:

— Памятаецце, як нашы калгасьні ы, Паронак Пятрусь, цэлых 60 вёрст даромна коняй ганяк? Ці-ж гэта ня кулацкая работа?..

— А яно і праўда, — дадае другі. — Недарма гаворыць, што адзін з гэтых работнічкаў сын жандара, а другі — родны брат раскулачанага кулака...

Доўга і з вялікай увагай абмяркоўвалі калгаснікі адозву зьезду і справаздачу свайго старшыні-дэлегата. А потым пачалі меркаваць, што самім трэба зрабіць, каб вясна не застала зьнянацку. Памеркавалі і парашылі.

Па-першае, абавязкі праўленьне неадкладна высьветліць справу Царонка і Яфроменкі і наогул дакладна праверыць склад калгасу, ачысьціўшы яго ад чужакоў.

Тут-жа на сходзе калгаснікі папярэдзілі Машненку і іншых гультаёў, што ў выпадку паўтарэньня з іх боку нядбайных і дэзарганізатарскіх адносін да работы — яны будуць выключаны з калгасу.

Калгаснікі абавязаліся не пазьней 1 сакавіка ўстанавіць севазваот, разьбіць зямлю на вучасткі, прымацаваўшы да іх адпаведныя брыгады. Прыняты таксама канкрэтныя абавязацельствы па пратручваньні насеньня, падрыхтоўцы збруі, па догляду коняй, рамонту с.-г. інвэнтару і інш.

Дэтальна абмяркоўваючы плян веснавой сяўбы, калгаснікі аднадушна пастанавілі засеяць яравы клін у 500 гэктараў максымум за 15 дзён, забясьпечыўшы ўраджай ня менш 9-10 цэнтн. збожжавых культур з адзнаго гэктара.

Урэшце, калгаснікі тут-жа на сходзе пастанавілі выклікаць калгас «Бальшавік» на спаборніцтва па лепшым правядзеньні веснавой сяўбы.

Слова ў заключэньне ўзяў калгасны рымар тав. Сямашка:

— Я, — кажа ён, — даю абяцаньне для ўсіх трох нашых брыгад за 5 дзён да пробнага высеву падрыхтаваць усю збруі так, каб і камар носу не падточыў. Ні адзін конь, каб не абмулёўся. Толькі-б добра працавалі брыгады. Няхай, вось, конюх трацяй брыгады скажа, як ён будзе дагледаць нашых коняй.

Адказ:

— Ну, што-ж, браточкі, адставаць не ахвота. Я ўсё пастараюся. І догляд, скажам, на сваёй стайні наладжу, і чыстку там штодзённую... так, каб коні былі што нада. Пабачым яшчэ, хто будзе працаваць лепш, — мы ці першая брыгада...

Потым па чарзе, адзін за адным, за старэйшым конюхам першай брыгады тав. Сарніцкім — загадчык малочнай фэрмы тав. Навіцкі і іншыя калгаснікі ўставалі і бралі канкрэтныя практычныя абавязкі па падрыхтоўцы да вясны.

... Сход зацягнуўся далёка за поўнач. Калгаснікі разыходзіліся вясёлыя, бадзёрыя, упэўненыя!..

В. ДАЛЬ.

Ворша.

КАНКРЭТНЫ АДКАЗ

Б.-КАШАЛЕВА, 27.

Адозва ўсесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў выклікала новую хвалю працоўнага энтузіязму сярод калгасных мас. Перадавыя калгасы раёну ў адказ на адозву ўсесаюзнага зьезду па-баявому рыхтуюцца да першай вясны другой пяцігодкі.

Прыклад паказвае калгас імя Варапылава, Кашалеўскага сельсавету. На сёмнішні дзень калгас цалкам і поўнасьцю ссыпаў усе насеньня і страхавыя фонды. Ссыпана высокаякаснае, адсартаванае і ачышчанае насеньне. Наладжана пільная ахова насенных фондаў.

Калгас падрыхтаваў да сяўбы ўсю конскую сілу. Усе коні добра дагледжаны і па сваім стане зьяўляюцца самымі лепшымі з усіх калгасаў раёну. За жывой цягавай сілай на час веснавой сяўбы забраніраваны спэцыяльны кармовы фонд. Заканчваецца рамонт с.-г. інвэнтару. З 20 лютага калгас распачаў вывазку ўгнасьняў.

Праведзена разьбіўка калгаснікаў па пастаянных вытворчых брыгадах.

„ГАТОВЫ ХОЦЬ СЁНЬНЯ ВЫЙСЬЦІ У ПОЛЕ..."

КРЫЧАЎ, 27.

У адказ на адозву ўсесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў, с.-г. арцель імя Варапылава разам з іншымі калгасамі раёну арганізуе 1 сакавіка пробны выхад у поле.

Калгаснікі па-бальшавіцку рыхтуюцца да веснавой сяўбы. Учесь сельска-гаспадарчы інвэнтар і збруі цалкам адрамантаваны. Калгас поўнасьцю ссыпаў насеньні і страхавы фонды. Ссыпанае насеньне ачышчана і адсартавана і знаходзіцца пад аховай выпрабаваных калгаснікаў.

Усе коні ў калгасе маюць добры выгляд. Коняй дагледае спэцыяльная брыгада конюхаў, якія прымацаваны да пасобных коняй.

Калгаснікі заяўляюць:

— «Мы і сёньня гатовы выйсьці ў поле»!

Больш клясавай пільнасьці на чыгунцы!

У першым і другім конкурсах спаранных і вагона-рамонтных брыгад Гомельскі чыгуначны раён вышаў на першае месца. Аб такіх паравозах, як С-52, ведала ўся краіна. Работа арганізацый і рабочых чыгуначнікаў у часе гэтых конкурсаў была сапраўды ўдарнай, бальшавіцкай.

Гомельскі чыгуначны раён зьяўляецца адным з буйнейшых у Беларусі, ён бясумоўна меў усе магчымасьці і ў трэцім конкурсе паравозьнікаў і вагоньнікаў заняць пачэснае месца. На справе-ж гомельскія паравозы адстаюць увесь час у конкурсе.

Тлумачыцца гэта тым, што партыйная і прафэсыянальная арганізацыі гомельскіх чыгуначнікаў з самага пачатку конкурсу не арганізавалі належнай падрыхтоўкі да конкурсу, не правялі як сьлед масава-растлумачальнай работы, не мабілізавалі чыгуначнікаў на барацьбу за першынства. У выніку здарылася тое, што конкурсныя паравозы з месяца ў месяц, з дэкады ў дэкаду працавалі ўсё горш і горш, што прадцысцыплінна сярод паравозьнікаў падала.

І сапраўды, чаго варт такі выпадак, калі адзін з перадавых паравозаў у Саюзе — С-52, удзельнік усесаюзнага конкурсу, набраўшы самую вялікую колькасьць балаў па раёну — 242,08, у канцы студзеня выключаецца з конкурсу. Прычына — здарэньні: выплаўка падшыпніка, паломка залатніковых колцаў. Гэты факт сьведчыць аб аслабленым спаборніцтва паравозьнікаў, аб аслабленьні прадцысцыпліны. Паравоз ОВ-508 выбыў з конкурсу з прычыны здарэньня на ст. Прыбар.

Лік выпадкаў пазаўтраньня паравозаў у студзені павялічыўся. У сьнежні такіх выпадкаў было ўсяго 6, а ў студзені зарэгістравана 27. У сярэднім кожны дзень па адным здарэньні і пазаўтраньні паравозу.

У чым прычына частых здарэньняў? Справа ў тым, што клясава-варожы элемэнт, які пралез на чыгунку, імкнецца дэзарганізаваць работу чыгункі, сарваць конкурс. Іменна такое становішча мела месца ў дэпо Гомель. Група кулакоў, якія прышлі з вёскі, фактычна вяла ў дэпо падрыўную работу, рабіла справу клясавага ворага.

У самы адказны момант работы транспарту, зьвязанай з зімовымі перавозкамі і 3-м усесаюзным конкурсам, яны арганізавалі кулацкі сабатаж і суграцёўленыя мерапрыемствам партыі па аздараўленьні транспарту. Сярод гэтай групы ёсьць і кулацкія элемэнты з партбілетамі ў кішэні.

Член КП(б)Б **Скуратовіч** — машыніст паравоза Щ-2055 — увесь час займаўся «очковтирательством», сьвядома зрываў падачу паравоза пад цягнік.

Другі «камуніст» **Гарасевіч** правіў сабатаж у рабоце.

З імі ў кампаніі быў і інструментальшчык **Сімкевіч.** У самы разгар рамонту ён адмаўляецца выдаваць інструменты.

Машыніст паравоза Щ-4517 **Лепановіч,** качагар паравоза С-281 **Кавалёў,** загадчык складу апалу **Шукала,** нам. машыніста паравоза С-1 **Прыходзька** — вось, хаця яшчэ і ня поўная галярэя клясава-варожых элемэнтаў, якія сваёй шкоднай работай сарвалі першынства Гомелю ў конкурсе, стварылі прарыў у рабоце дэпо. 26 раз псавалі паравозы ў дарозе і зусім сьвядома 14 раз неправячасова падалі паравозы пад цягнікі.

Характэрна, што ўсё гэта праходзіла на вачох партыйнай арганізацыі дэпо, якая «не заважыла» ворага. Дзе-ж была рэвалюцыйная пільнасьць?

Толькі пасьля ўмяшаньня партарганізатара 5 чыг. эксплёатацыйнага раёну і газэты «На сацыялістычных рэйках» контр-рэвалюцыйныя элемэнты выкрыты. Пры непасрэдным удзеле партарганізатара тав. **Палякоўскага,** група кулацкіх элемэнтаў выкрыта і разьбіта. Партарганізацыя дэпо павінна зрабіць з гэтай справы вывады.

Зараз ход конкурсу яўна пэдавальнючы. Паравозы-ўдзельнікі ўсесаюзнага конкурсу С-52 і С-60 у студзені занялі толькі 5 і 9 месца. С-52 — па перададні выключэньня з конкурсу з прычыны здарэньняў — псаваньняў у дарозе. У сьнежні і студзені было шмат выпадкаў выключэньня з конкурсу. Вельмі мала паравозаў выканалі пастаўленыя ўмовы. Асабліва дэнна працавалі ў студзені паравозы ўдзельнікі усебеларускага конкурсу. Паравозы Щ-19, Щ-1551, Щ-5066 набралі толькі ад 51 да 83 балаў.

Становішча, якое сварылася ў часе конкурсу па Гомельскім вузле, зьяўляецца зусім пэвыпадковым. З аднаго боку — падрыўная работа ціла савета ворага, а з другога — прытушленьне клясавай пільнасьці, слабасьць кіруючага апарату ў асобных зьвеньнях, найменьше ўспачаліць энтузіязм мас, адсутнасьць апэрацыйнага кіраўніцтва конкурсам.

На фоне агульнага адставаньня рэзка выдзяляюцца тыя галіны і вучасткі, дзе ў выніку добра разгорнутай партыйна-масавай і выхаваўчай работы ёсьць значныя зрухі ў працы. Так паравоз С-814 мае эканомію апалу 22,3 проц., нормы прабегу пры заданьні ў 3.981 выканаў 4.311, мае нагону 97 мінут і г. д. Паравоз С-13 мае эканомію 17,57 проц., нормы прабегу пры заданьні ў 3.780 выканаў 4.560, нагону — 60 мінут. Паравоз С-331 мае эканомію апалу 8,94 проц., пры заданьні прабегу ў 3.981 выканаў 4.248, мае 126 мінут нагону.

На паказных паравозах добра разгорнута масавая работа, праводзяцца вытворчыя нарады брыгад разам з шэфамі паравозаў і рамонтнымі брыгадамі. Такія нарады арганізаваны па ініцыятыве камсамольскага паравозу дэпо Гомель Щ-3125 на паравозах Щ-4517 і 5066. Брыгады абменьваліся вопытам сваёй работы, выяўлялі недахопы і памылкі.

На тых вучастках, дзе парт. і прафгрупы працавалі добра, ёсьць значныя посьпехі. Вось некалькі прыкладаў работы дэпо. Партгрупа брыгады **Ліса** па прамываньні рамонце паравозаў (ступеньчатае дэпо) распачала масавую прапрацоўку пастаноў пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б). Усе абавязацельствы па конкурсу брыгада выканала. На працяку двух месяцаў ня было ні аднаго прагулу, ні аднаго спазьненьня на работу. Выпадкаў спазьненьня або пазьдачы паравоза пад цягнік па віне брыгады ня было. Брыгада Ліса ўзяла шэфства над конкурснымі паравозамі Щ-464 і С-460.

Прапрацоўка пастаноў пленуму выклікала хвалю творчага энтузіязму. Поршня-дышлявая брыгада **Лазаева** (старое дэпо) таксама паказала ў конкурсе добрыя прыклады работы. Лепшы ўзор работы паказвае брыгада маншэра **Падкапаева** (ступеньчатае дэпо). Брыгада складаецца з 10 чалавек. На яе сходах ставяцца практычныя пытаньні: аб паўторнасьці рамонту па паравозах Щ-4787, ОВ-84/1, аб узацыі шэфства над паравозам С-249, аб праверцы сацтагаварох і інш. Брыгада спэцыяльна абмяркоўвала на сходзе пытаньне аб сьлесарах **Папяпухіне** і арматурнічку **Скорані,** па віне якіх быў паўторны рамонт. У другой палове сьнежня за паўторнасьць рамонту і аслабленьне шэфства над паравозам № 249 брыгада была занесена на чорную дошку. На сваім сходзе брыгада абавязалася змыць з сябе гэтуганебную плямку і выйсьці зноў у перадавыя. Гэта абавязацельства не засталося на паперы. У самы цяжкі момант работы дэпо брыгада ліквідавала прарыў выпускам з рамонту 4 паравозаў раней тэрміну на 8 гадзін. Ударная работа брыгада зьняла сябе з чорнай дошкі.

Добра працуе вагона-рамонтная брыгада **Сталярчука** (дэпо сартыровачная). У студзені пры сэдальні на рамонт аднаго вагона 6,91 чалавекагадзіны, работа выканана за 3,82. Эканомія па гаспадарчым разрахунку — 145 руб. 86 кап. Сярэдні прастой вагона ў рамонце пры заданьні ў 4 гадзіны фактычна складае 2,82. Брыгада Сталярчука прымае актыўны ўдзел у грамадзкім жыцьці, у выпуску насьцэнгазэт і г. д. Рамонтная брыгада Сталярчука прымае ўдзел у дарожным конкурсе і ідзе ўпэрадзе — мае 668 балаў.

Гэта яшчэ няпоўны сьпіс перадавікоў. Сярод лепшых брыгад лічыцца брыгада саставіцеля **Пастушонка,** сцяпічыка **Трацьцьякова,** саставіцеля **Жалезьня**[illegible]шчыка **Канецкага.** За час[illegible] гэтыя брыгады дасягнулі сваячасовай апэрацыі цягнікоў па раскладу, паляпшэньня грамадзкай работы і інш.

Работа перадавых брыгад паказвае, што гомельскія чыгуначнікі маюць усе магчымасьці і ў трэцім конкурсе заняць перадавое месца. Неабходна пашырыць вопыт перадавых, вопыт лепшых, вышэй тэрмінаў хвалю сацыялістычнага спаборніцтва. Ачышчаючы свае рады ад клясава-варожых элемэнтаў, павышаючы пралетарскую пільнасьць, трэба дабіцца карэннага пералому ў рабоце ўсіх вучасткаў чыгуначнага вузла. Пасьлядні будзе залежыць у першую чаргу ад мабілізаванасьці партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных арганізацый і ўсёй масы чыгуначнікаў.

Н. Г[illegible]

8 ГАДОВЫ КАТАРЖНЫ ПРЫСУД НАД Б. ТАРАШКЕВІЧАМ ЗАЦЬВЕРДЖАН

ВІЛЬНЯ, 25. Як падае віленская фашысцкая прэса, 24 лютага адбыўся апэляцыйны суд над правадыром разгромленай фашызмам стотысячнай Беларускай Грамады Б. Тарашкевічам. У канцы лістапада мінулага года Б. Тарашкевіч быў засуджан па 8 год катаргі па абвінавачаньні ў «антыдзяржаўнай» дзейнасьці.

Васьмігадовы катаржны прыгавор не задаволіў фашысцкага служыўца—пракурора. Ён падаў скаргу ў апэляцыйны суд з патрабаваньнем павялічыць кару.

Апэлявала таксама і абарона Тарашкевіча, якая ў акце абвінавачаньня і ў самім прысудзе бачыла поўную неўпрунтаванасьць і беспадстаўнасьць нават ва ўмовах Польшчы. Паводле абвінавачэньня акту Тарашкевіч абвінавачваецца ў кіраўніцтве выбарчай кампаніяй у сойм і сэнат, што нават паводле польскага буржуазнага права ня можа карацца. Па-другое, у гэтай выбарчай кампаніі Б. Тарашкевіч ня мае ніякіх тэрыторый Данцыгу, г. зн. па-за межамі Польшчы, што яшчэ такі паводле польскага буржуаз нага карнага кадэксу не падлягае польскаму суду.

Тарашкевіч на судзе ня прызнаў сябе вінаватым, зазначаючы, што ў сваёй дзейнасьці нічога злога ня бачыць.

Суд прыгавор першай інстанцыі, г. зн. 8 год катаргі, зацьвердзіў. Апрача таго, пастанавіў **спагнаць з Тарашкевіча ў карысьць дзяржавы яшчэ 1.200 злотых судовых выдаткаў.**

Як зазначае фашысцкі чорнасотенны «Дзеньнік Віленскі», Тарашкевіч выслухаў прыгавор спакойна з усьмешкай на вусах.

**

Як ня раз зазначалася ў «Зьвязьдзе», справа шматгадовага катаржнага прыгавору над Б. Тарашкевічам зусім не залежыць ад тэй ці іншай ступені віны падсуднага. Фашызм жорстка расправяецца з Тарашкевічам таму, што ён не пайшоў у лягер фашызму, не захацеў паискай паскі, хацеў гандлявацьі крывёю і потам беларускіх працоўных мас, што ён застаўся верным абаронцай гэтых мас ад акупанцкага ўраду. У гэтым сэнс шматгадовага катаржнага прысуду над Тарашкевічам.

Вынесчы суровы прыгавор над Б. Тарашкевічам, фашызм тым самым наносіць удар і па нацыянальна-вызваленчым руху беларускіх працоўных мас. Для задушэньня рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху фашызм ня спыняецца ні перад чым. Тая правакацыйная сьвістапляска, якую вя па фашысцкая прэса вакол Тарашкевіча ў часе акруговага суда, сьведчыць, што фашызм імкнецца ачарніць, зганьбіць правадыра нацыянальна-вызваленчага руху, а тым самым і самы нацыянальна-вызваленчы рух, нанесьці яму ўдар. Па-другое, гэтай бруднай правакацыйнай кампаніяй фашызм імкнуўся замазаць правал дэфэнзывы і яе дапаможнікаў—беларускіх нацыянал-фашыстаў у справе фабрыкацыі абвінавачэньня акту, нацкаваць грамадзкую думку шэрэннай Польшчы на беларускія працоўныя масы.

У дзень пачатку апэляцыйнага суда орган віленскіх пілсудчыкаў «КУР'ЕР ВІЛЕНСКІ» зьмясьціў перадавы артыкул прысьвечаны справе Тарашкевіча. У гэтым артыкуле фашысцкая зграя выступае з двуліцымі пахвалами па адрасу падсуднага. Што-ж мы бачым у гэтым артыкуле? «Тарашкевіч, які пераклаў на беларускую мову «Пана Тадэўша» «Энэіду», «Іліяду» ня можа быць і не зьяўляецца ворагам польскага народу». А ў гэты самы час суд зацьвярджае 8 год катаргі.

Гэта выступленьне фашысцкай шматы паказвае на манэўры фашызму, накіраваныя да таго, каб перацягнуць у свой лягер Тарашкевіча, разпажыць нацыянальна-вызваленчы рух з сярэдзіны, дапамагчы беларускаму нацыянал-фашызму апанаваць гэтым рухам.

Аднак, манэўры фашызму і на гэты раз жорстка праваліліся. Ні тэрор, ні ваенна-палявыя суды з іх шыбеніцамі, ні шматгадовая катарга—не дапамагаюць. Працоўныя масы добра ведаюць, што ТОЛЬКІ ШЛЯХАМ УПАРТАЙ БАРАЦЬБЫ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КПЗБ ЯНЫ ЗДОЛЕЮЦЬ РАЗ НА ЗАЎСЁДЫ ВЫЗВАЛІЦЦА З-ПАД УЛАДЫ АКУПАНТА, З ГАЛЕЧЫ І ГОЛАДУ.

„Польшча ня можа разэбройвацца"

ВАРШАВА, 25. (ТАСС). Учора ў польскім сэнаце адбыліся спрэчкі па бюджэту міністэрства замежных спраў. У спрэчках выступіў прадстаўнік эндэкаў сэнатар **Казіцкі**, які заявіў: «мы лічым, што пакт аб пенападзе з СССР не зьяўляецца фармальнасьцю, а грунтуецца на гістарычнай неабходнасьці. Увага СССР зьвернута на Ўсход. Ён заняты ўнутранымі справамі і прынятыя ім на сябе ўнутраныя абавязацельствы не зьяўляюцца дыплёматычным манэўрам, а ў поўнай меры зьяўляюцца натуральнымі. Пакт аб пенападзе зьяўляецца апошнім актам, ліквідуючым тую палітычную сыстэму, якая была накіравана супроць Савецкага саюзу і зьвязвала з гэтым сваю фэдэралістычную праграму».

Казіцкі падкрэсьлівае, што гэта палітычная сыстэма прынесла вялікую шкоду Польшчы.

Пераходзячы да адносін з Германіяй, Казіцкі заявіў, што напіск Германіі, які ўсё больш узмацняецца пры мушае Польшчу быць на варце. **Прамоўца лічыць шкодным для Польшчы так званую ліквідацыйную згоду і іншыя дагавары з Германіяй**, якія «аслабляюць сілу польскага элемэнту на Заходніх граніцах». «Тут не патрэбны ні ваяўнічыя антыгерманскія лёзунгі, ні звон шабляў»,—заявіў Казіцкі. «Тут неабходна цьвёрдая палітыка і мудрая ўнутраная работа. Польшча ня можа разбройвацца. Неабходны цесны саюз Польшчы з Францыяй незалежна ад таго, ці захапляе той, або іншы французкі ўрад магчымасьцю прымірэньня з Германіяй. Неабходна стаючча адносіцца да двойнасьці дзяржаў Малой Антанты».

Адгукаючыся на дыскусію ў соймавай замежнай камісіі афіцыёзная «Газэта Польска» піша: «Асновы польска-французкага саюзу аніраюцца на найбольш глыбокім разуменьні дзяржаўных інтарэсаў абодвых бакоў. У гэтых адносінах польская грамадзкая думка зусім аднадушна».

Фашысцкі тэрор у Германіі ўзмацняецца

БЭРЛІН, 25 (ТАСС). Паводле даных палітычнай паліцыі г. Бэрліну, за апошнія два дні канфіскавана шмат друкаваных твораў, якія сваім зьместам «падбухторваюць насельніцтва да беспарадкаў». Паводле тых жа даных, паліцыяй канфіскавана ў друкарні ЦК Германскай кампартыі 28.000 экз. лістовак, на складзе выдавецтва «Інтэрнацыяналер Арбэйтар Фэрлах» —100. 000 экз. і ў другім рабочым выдавецтве—25.000 лістовак. Апрача таго, паліцыя закрыла друкарню ў Нэйкэльні, дзе па ня заяве нібы знойдзена шмат літаратуры.

Сёньня канфіскован левы рабочы сатырычны журнал «Ротэ Пфэфэр». Вынята з продажу 25.000 экз. гэтага журналу.

1600 ЗАСУДЖАНЫХ РАБОЧЫХ НА ПРАЦЯГУ З ДЗЁН

ПАРЫЖ, 25 (ТАСС). «Журналь» прыводзіць заяву начальніка бесарабскай паліцыі **Маймуна** аб тым, што ў сувязі з апошнімі падзеямі из працягу трох дзён у Бэсарабіі былі асуджаны на падставе «закону аб дзяржаўнай бяспецы **1600 небясьпечных агітатараў**». **Большая частка асуджаных была прыгаворана да турэмнага зьняволеньня на тэрмін ад 2 да 10 год.** Аб лёсе астатніх асуджаных Майнука нічога не паведаміў.

Камісія па арганізацыі пахаваньня прафэсара Пётра Астархавіча

МАЎРЫДЗІАДЗІ

паведамляе, што вынас цела адбудзецца 1 сакавіка а 12 гадз. дня з памяшканьня Мядыцынскага Інстытуту (Мяд. корпус. Унівэрсітэцкі гарадок).

Камісія.

Правільнай арганізацыяй працы ў лесе, поўнай нагрузкай каня— забясьпечым уздым прадукцыйнасьці працы на лесазагатоўках

У ЛЕС НА АДПАЧЫНАК

На 20 лютага плян па загатоўцы дзелавой драўніны выканан **Лепельскім леспрамгасам** на 65,4 проц. і дроў на 61,6 проц. Па вывазцы дзелавой драўніны заданьне выканана па 45,4 проц. і дроў на 56,5 проц.

Характэрна, што студзень як на загатоўцы, так і па вывазцы ня даў амаль нічога. Дзесяткі калгасаў у лес ня езьдзілі ні разу, ня гледзячы на заключаныя дагавары, на атрыманыя авансы грашыма і дэфіцытнымі прамтаварамі.

Уся бяда ў тым, што сельсаветы, праўленні калгасаў і партыйныя ячэйкі ў сваёй пераважнай большасьці фармальна аднесьліся да давядзеньня плянаў і выкананьня дагавораў. У радзе калгасаў раёну вытворчыя брыгады на мелі апэрацыйнага заданьня, ня ведалі, колькі людзей і коняй трэба штодзённа пасылаць у лес («Авангард», імя Леніна, «Камунар», «Зьвязда»—Несінскага сельсавету, «Камінтэрн», «Батрак», «Поўдзень» — Каменскага сельсавету і інш.). Спадзяючыся адзін на аднаго, калгасьнікі ў лес ня ехалі. Паравжная-ж большасьць па-ранейшаму марудзіць з выкананьнем заключаных дагавораў.

Калгас «Праца», Палянскага сельсавету, абавязаўся паводле дагавору вывезьці 2.000 кбм. драўніны. Калгас мае больш 150 рабочых коняй, з якіх у лес штодзённа можна пасылаць 100-120, а між тым пасылаецца менш пятай часткі. Значная частка коняй (часам каля 30 проц.) штодзённа разьбіраецца калгасьнікамі для сваіх уласных разьездаў (на базар, у госьці і г. д.).

Нагрузка на каня ў калгасе **імя Войкава** не перавышае 0,4 кбм. Гэты калгас, маючы заданьне ў 2.500 кбм., вывез усяго 237, або 9,5 проц. Такое-ж становішча і ў калгасе **«Трэці рашаючы»** і многіх іншых.

Дзесяткі людзей з гэтых калгасаў едуць у лес толькі для таго, каб адпачыць. Яны цэлымі гадзінамі ходзяць з дзялянкі на дзялянку, таўкуцца ў канторы вучастку, запаўняюць сталовыя і г. д. Ім—гультаём—у энач най меры спрыяе выключная пераста ропнасьць паасобных прыёмшчыкаў, асабліва па румах Стары Лепель, Буляпы, Юркава сьцяна. Прыёмшчыкі прымушаюць возчыкаў прастойваць па 2-3 гадзіны, пакуль яны афармяць і прымуць прывезеныя дровы.

Такой галавацяпскай прыёмкай асабліва адзначаецца прараб Задэкляк скага вучастку **Мазговіч**. Гэты чалавек лічыць для сябе гонарам, што яму ўдалося дасягнуць скарачэньня «бюракратычнага ўліку». Мазговіч зрабіў вельмі проста: замест таго, каб улічваць кожнага калгасьніка, яго дзённую выпрацоўку, ён пачаў улічваць выпрацоўку брыгады цалкам. Вынікі адразу адчуліся—зьменшылася нагрузка на каня.

Сельсаветы, якія вырашаюць посьпех сваячасовай вывазкі і загатоўкі лесу, якія знаходзяцца ў самім лесе, ганебна цягнуцца ў хвасьце па выкананьні сваіх плянаў.

Сакратар партыйнай ячэйкі **Сьвяцкага** сельсавету **Шалак** ня толькі не забясьпечыў разгортваньня масавараслумачальнай работы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў аб усёй палітычнай важнасьці сваячасовай вывазкі лесу, ня толькі не забясьпечыў апэрацыйнага кіраўніцтва камуністамі, але бяро стаўку на вывазку лесу ў сакавіку, г. зн. у тым месяцы, які павінен быць у значнай меры скарыстан для арганізацыі адпачынку коняй, каб іх падрыхтаваць да веснавой сяўбы.

Несінскі сельсавет сваё заданьне выканаў на 11,5 проц., **Красналуцкі** — на 13,9 проц., **Латыгаліцкі**—12,1 проц., **Кашчынскі**—13,8 проц. і **Палянскі**—16,9 проц. Гэта сельсаветы, якія знаходзяцца непасрэдна ў лесе і маюць найбольшыя заданьні.

Аб недаацэнцы значэньня сваячасовай вывазкі лесу сьведчаць галавацяпскія пастановы раду сельсаветаў. У **Каменскім** сельсавеце ёсьць чатыры калгасы, якія маюць каля 1.000 рабочых коняй. Аднаасобных гаспадарак — толькі 40. Заданьне ў 3.000 кбм. для вывазкі сельсавет разьвярстаў так: калгасам вывезьці 1.400 кбм., г. зн. 1,4 кбм. на каня, і аднаасобнікам 1.600, г. зн. 40 кбм. на каня. Падліча на, што ў гэтым сельсавеце, з-за значнай адлегласьці ад лясной дачы, ніяк нельга вывезьці на працягу кварталу адным канём 40 кбм., нават пры бесьперапыннай рабоце.

Такое галавацяпскае разьвярстаньне пляну — лішні доказ нежаданьня многіх работнікаў сапраўды па-ўдарнаму змагацца за пасьпяховае выкананьне пляну. Такія настановы, апрача дапамогі кулаку ў яго шалёнай агітацыі супроць вывазкі лесу, зразумела, ніякай карысьці не даюць.

Ёсьць у работнікаў сельсавету і другога роду тэндэнцыі, якія характарызуюць супраціўленьне кулацкага парадку, сьведчаць аб сабатажы загатовак. Замест таго, каб прымусіць цьвёрдазаданьнікаў выконваць свае заданьні, паасобныя камуністы, работнікі Прудокскага сельсавету (Парахонька і інш.) спрачаюцца, ці рэальнае заданьне для цьвёрдазаданьнікаў.

Значным тормазам у загатоўцы і вывазцы лесу зьяўляецца зусім дрэнная работа лесрабкопу. Старшыня праўленьня лесрабкопу **Бадроў** наўрад ці можа знайсьці сабе канкурэнта па галавацяпскім вышэходзтве. Ужо колькі часу, як леспрамгас дамагаецца, каб лесрабкоп даў на вучастках ланцугі для зьвязваньня бярвеньняў, але ланцугі і сёньня яшчэ ляжаць на базе.

Дробная справа — тутэй. Возчык патрабуе тутуну, яму не даюць. А тутэй ёсьць, нават некалькі дзесяткаў яшчыкаў, але яны ляжаць пад замком у таго-ж Бадрова.

Яшчэ горш становішча з грамадзкім харчаваньнем. Якасьць абедаў зусім дрэнная. Часта бывае так, што рабочыя і возчыкі застаюцца па некалькі дзён без харчаваньня па віне таго-ж самага лесрабкопу.

Вось у асноўным прычыны, якія тармозяць выкананьне пляну па загатоўцы і вывазцы лесу Лепельскім лес прамгасам. Чым хутчэй будуць ліквідаваны гэтыя тормазы, тым лепш будзе забясьпечана бесьперабойная работа па вывазцы будаўнічых матар'ялаў і дроў.

Ул.

Камсамольскі лесавучастак адстае

Камсамольскі лесавучастак Рэчыцкага леспрамгасу ганебна адстае ў загатоўцы і вывазцы лесу. Лепшыя месяцы па загатоўцы экспартнага дубу —лістапад, сьнежань і студзень—прараблова праміргала. Замест 200-300 лесарубаў, на загатоўцы праца вала толькі 50.

Нічога не зрабіў вучастак і па вяр боўцы рабочай сілы. Лесарубы прыхо дзілі працаваць у лес і стыхійна пакідалі работу. Камсамольская ячэйка вучастку, якая налічвае 34 камсамольцы, нічога ня робіць. Няма ні ад ной ударнай камсамольскай брыгады, няма ўдарнікаў, няма насьценнай газэты. Адсутнічае масавая работа.

Паўстае пытаньне, што-ж робіць райком камсамолу, калі дапусьціў да такога становішча свой вучастак? Са кратар РК ЛКСМБ **Мацьвееў** даўно казаў: «Мы займемся камсамольскім вучасткам, ён будзе ў нас працаваць, як гадзіньнік, прыкладам будзе для іншых». Пакуль што вучастак працуе, як гадзіньнік з сапсаванымі мэханіямам. Прабел Мацьвеева пакаўняюць кулакі-там, дзе адсутнічае наша палітычна-масавая работа, разгортваюць агітацыю яны.

Ня дзіва пасьля гэтага, што замест 900 фурманак выяжджае ў лес толькі 400-500, замест 300 лесарубаў працуе 160. З 20 цьвёрдазаданьнікаў выконваюць заданьні па лесазагатоўцы і вывазцы толькі 4, дый то два з іх — **Налягач Сава і Дзедзік Аляксей** — правёўшы шырокую агітацыю за зрыў лесазагатовак: «мала плацяць, лепш будзем сядзець дома, нічога яны з намі ня зробяць», пакінулі працу. За імі паехалі два падкулачнікі—**Кавалюк Мікалай і Пінчук Рыгор.**

На вытворчай нарадзе работнікаў вучастку разам са старшынямі, прымацаванымі да іх сельсаветаў і калгасаў, высьвятлілася поўная непаваротлівасьць апарату прараблства. Тэхнік **Багданаў** ня ведае колькі загатоўлена і вывезена лесу на яго вучастку, ня ведае добра і пляну. Намесьнік прараба **Беластоцкі**, выступаючы ў спрэчках сказаў: «Я прымацован да Ліскаўскага сельсавету, актыўна працаваў у в. Крынкі. Аб гэтым вам скажа сакратар партыйнай ячэйкі сельсавету тав. Цімашэнка». А Цімашэнка ў вымушанай справаздачы прызнаўся, што ў сельсавеце да апошніх дзён нічога не рабілі—былі заняты штурмам па загатоўцы збожжа, бульбы і ільну. Замест 391, фурманак выяжджала толькі 80-90, а ў Беластоцкага хапае нахабнасьці сталіць сельсавет прыкладам ударнай работы.

Злосным зрыўшчыкам лесавывазкі зьяўляецца калгас «Ландарэт», які заключыў дагавор з прарабетам, атрымаў авансам 10 цэнтн. аўса, а на загатоўкі не выяжджае.

Лепш за ўсе калгасы рабну працуе калгас **«Якаўлева»**, які першым пачаў вывозіць лес. Квартальны плян гэтым калгасам ужо выканан на 50 проц. Гэта нябывалыя паказальнікі па ўсім Рэчыцкім леспрамгасе. За ўдарную работу па лесавывазцы вучастак пастанавіў прэміяваць калгас «Якаўлева» прамтаварамі на 120 руб. Калі ўсе калгасы раёну будуць працаваць так, як гэты калгас, дык врух у лесавывазцы будзе дасягнут.

Дашкевіч.

Дрожджы—новая крыніца кармовых рэсурсаў

Віцебскі завод «Вызваленая праца» Белбродаб'яднаньня ставіць вопыты вырабу спэцыяльных кармовых дрожджаў для падкармліваньня жывёлы і птушкі. Завод цалкам пераключаецца на выраб гэтых дрожджаў.

Як і пякарскія кармовыя дрожджы вы рабляюцца з адыходаў буракова-цукровай вытворчасьці—мэлясы.

У адрозьненьне ад пякарскіх дрожджаў, кармовыя дрожджы размнажаюцца значна больш. Выхад дрожджаў пераўвальна з пякарскімі ўзрастае на 30-40 проц. Яны ўладаюць таксама ўласьцівасьцю накапляць у сваёй пратаплазме значна больш бялковых матэрый.

Эфэктыўнасьць ужываньня ў жывёлагадоўлі пякарскіх дрожджаў (больш дарагіх, чым кармовыя) ужо высьветлена цэлым радам вопытаў, праведзеных, у прыватнасьці пад кіраўніцтвам акадэмі ка Леантовіча ў Маскве. Да звычайных кармовых рацыёнаў куранят дадавалася 4 проц. сухіх пякарскіх дрожджаў. У выніку—на 71 дзень кармленьня вага курашят дасягае 600 грам, тады як вага куранят, не атрымліваўшых іх, не перавышала 300 грам.

Для дэтальнага высьвятленьня спажыўных уласьцівасьцяй і вітамінасьці кармовых дрожджаў, высьвятленьне эканомнасьці ўжываньня іх у жывёлагадоўчых і пшутэкагадоўчых гаспадарках будзе праведзен рад вопытаў пад кіраўніцтвам праф. Папова і праф. Дзякава.

У залежнасьці ад вынікаў гэтых вопытаў будзе вырашана пытаньне аб буд аўніцтве спэцыяльных заводаў для за давальненьня патрэб сельскай гаспадарки.

Адкрыўся зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў Маскоўскай вобласьці

25 лютага ў Маскве адкрыўся першы абласны зьезд калгасьнікаў-ударнікаў Маскоўскай вобласьці.

На трыбуну Калённай залі Дому саюзаў падымаюцца т. т. **М. М. Кагановіч, Рынкзін, Камінскі, Міхайлаў, Хрушчоў, Пэтэрс, Гей, Ягораў, Даненка, Булгакін** і інш. Зьяўленьне іх залы сустракае бурнымі апладысмэнтамі. Адкрываючы зьлёт, сакратар МК Усе КП(б) **Рынкзін** абрысаваў сялянскую долю ў памепчыцкай Расіі.

«... Прыгонніцкае рабства, памепчыцкая кулацкая кабала, масавы голад, бясправе—такавы ўмовы жыцьця працоўных сялян у мінулым.

Толькі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі працоўнае сялянства стала на адзіна правільны шлях калектывізацыі, на сьветлы шлях выхаду з галечы і кабалы.

На аснове першых перамог калгаснага руху мільёны бядняцкіх, аб'яднаныя ў калгасы, ужо зараз падняліся да ўзроўню серадняцкіх. **Наша задача —узьняць калгасьнікаў, былых бедняцкіх і серадняцкіх яшчэ вышэй, зрабіць іх усіх заможнымі».**

Прапанову выбраць у гонаровы прэзыдыум т. т. **Сталіна, Молатава, Калініна, Варашылава, Ірдзянікідзэ, Кагановіча, Куйбышава, Рудзутака, Кірава, Андрэева, Касіора, Постышава, Сулімава, Якаўлева**—заля сустрэла бурнай авацыяй і крыкамі «ўра».

Пад бурныя апладысмэнты зьлёт прыняў прывітаньне ЦК партыі —т. **Сталіну, ураду—Калініну і Молатаву** і правадыру Чырвонай армії — **Варашылаву.**

З дакладам аб выніках усесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў і аб падрыхтоўцы да сяўбы у Маскоўскай вобласьці выступіў сакратар МК Усе КП(б) тав. Міхайлаў.

Ён заклікаў зьлёт па-ўдарнаму завяршыць падрыхтоўку, паказаць на справе, што калгасы ў Маскоўскай вобласьці сустрэнуць другую пяцігодку ў першых радох ударнікаў сацыялістычных палёў, даб'юць рэшткі кулацтва, выкрыюць усе ў любой форме замаскаваныя спробы клясавага ворага сарваць наша будаўніцтва, будуць пільна берагчы грамадзка-калгасную ўласнасьць.

Сёньня фініш конкурсу

Паводле пастановы журы ўсебеларускага конкурсу спаракных і вагонарэмонтных брыгад, 28-га лютага — фініш уязьлікаў конкурсу. Фініш павінен быць праведзен па прыкладу старту. Сакавік абвяшчаецца месяцам праверкі і замацаваньня вынікаў конкурсу.

Задача заключаецца ў тым, каб не аслабляць тэмпаў і якасьці работы, узятых у часе конкурсу, каб і далей разгортваць сацыялістычнае спаборніцтва за вышэйшыя паказальнікі, за выразную і баявую работу транспарту.

Памяці тав. Р. А. ГОЛІАТА

Няўмольная сьмерць вырвала з радоў старой чэкісцкай гвардыі яшчэ адну ахвяру.

Уначы з 25 на 26 лютага, пасьля доўгай, цяжкай хваробы памёр старэйшы чэкіст пагранічнік, бальшавік, тав. **Рэйнгольд Андрэевіч Голіат.**

Гэты патомственны, гонаровы пралетар, які з 14 год паступіў вучнем на суднабудаўнічы завод, у першыя-жа бойкі вялікага 1917 году выступае са зброяй у руках, як чырвонагвардзеец, на абарону пралетарскай рэвалюцыі і сваім уступленьнем у рады камуністычнай партыі назаўсёды зарэсьлівае свой далейшы жыцьцёвы шлях.

Пэрыяд 1917—1919 г. г. для тав. Голіата зьявіўся пэрыядам загартаваньня ў гарніле грамадзянскай вайны, у баёх з белагвардзейскай нечысьцю, а ўжо з 1919 г. ён пасылаецца партыяй на адказнейшы вучастак фронту — у органы ВЧК, а пазьней — на ахову мяжы Савецкага саюзу.

Ведаючы аб сваёй сур'ёзнай хваробе, тав. Голіат, ня гледзячы на яе, не шчадзіў сябе на рабоце і на ўсе прапановы і заявы і дактароў, і акружаючых аб неабходнасьці сур'ёзнага лячэньня, адгаворваўся занятасьцю, адсутнасьцю часу.

Толькі тады, калі хвароба канчаткова падтачыла сілы гэтага салдата партыі, ён зьлёг у пасьцель, але папер ужо з яе не падняўся.

Бывай тав. Голіат!

Бывай Рэйнгольд!

Калектыў супрацоўнікаў УПА і войск АДПУ па БССР.

Калектыў супрацоўнікаў УПА і войск АДПУ па БССР паведамляе аб сьмерці старэйшага пагранічніка-чэкіста тав. **Рэйнгольда Андрэевіча Голіата** і выказвае сям'і нябошчыка самае глыбокае спачуваньне.

Калектыў супрацоўнікаў УПА і войск АДПУ па БССР.

ПАПРАЎКА

У пастанове СНК БССР і ЦК КП(б)Б «Пра абавязковую пастаўку збожжа дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадарамі», зьмешчанай у «Зьвязьдзе» № 45 ад 26 лютага, у першай групе раёнаў чатырнаццатым павінен стаяць замест Тураўскага Сураскі раён.

Паведамленьні

Сьпіс дакладчыкаў, выдзеленых Менгаркомам КП(б)Б для правядзеньня дакладаў на прадпрыемствах аб міжнародным жаночым камуністычным дні — 8 сакавіка.

Кансультацыі для дакладчыкаў адбудзецца 2 сакавіка, а 7 гадз. увечары ў гаркоме КП(б)Б (пакой 32).

Тав. Андрэйчыкава (ЦК КП(б)Б)—завод імя Варашылава, Курцін (ЦК КП(б)Б)—зав. «Камунар», Чыжова (КІЖ) —«Вальшавік», Лейін (с.-г. школа) — зав. імя Молатава, Апуцынік (Гіспарт)—ф-ка «Кастрычнік», Будзевіч (БАН) — зав. «Ударнік», Лур'е (с.-г. школа) — абутковая фабрыка, Лойка (с.-г. школа)—сутэ, Сьвярдлова (ЦКК КП(б)Б)—хлебазавод, Ляўкова (Гіспарт)—пічатчная фабрыка, Шапіра (Вярх. суд)—«Камунарка», Лібэнзон (Бімэо)—друкарня імя Сталіна, Шапіра (рэд. «Раб. Калг.») —мясакамбінат, Зайчык (НКЗ)—футравая ф-ка, Мар'ясіна (НКЮ)—ф-ка «з са кавіка», Бугко (рэд. «Раб. калг.»)—ф-ка «Ўсход», Кагапава (ЦК КП(б)Б)—з-д «Беларусь», Белкіна («Савецкая Беларусь)—хэмфармазавод, Капелева (ЦК КП(б)Б)—«Чырвоны хэмік», Шыфрын (НКЮ)—сыпіртазавод, Яўна (Вярх. суд) — завод «Пралетары», Альшынская (с.-г. школа)—«Чырвоны золак», Опарава (ВАН)—ф-ка імя Фрунзэ, Сяробава (ЦК КП(б)Б)—«Чырвоны тэкстыльшчык», Левіт (ЦК КП(б)Б—шпалерная фабрыка, Турбовіч (БАН)—ф-ка імя Крупскай, Галаскок (Камунбанк)—лямпавая фабрыка, Эпштэйн (Бімэо)—электрастанцыя, Белкіна (НКЮ)—абутковыя майст., Некрашэвіч (ВДВ)—Уцільскур, Гурвіч Ц. (ЦК КП(б)Б)—трэнкам харчавік, Дзямідовіч (ЦК КП(б)Б) — завод малочных кіслот, Бейкачоў (ГОПС)—УВА, Марусевіч (Наркамзем)—БОЙКА, Слуцкі (ГК камсамолу)—ФЗВ «КІМ», Асіпчык (ГК КП(б)Б)—трактарныя майстэрні, Вальфсон (ГК КП(б)Б) —арц. «Чырвоны абутнік», Жукоў (Бімэо)—арц. «Чырвоны мэтальіст», Растоўская (ГК КП(б)Б)—арцель імя Крупскай, Сакольчык (Наркамтраны)—Аўтарэмсклад, Бараксўская (Белта) — аўта-майстэрні, Балабанава (Наркамюст)—дзюто, Апаровіч (ЦК КП(б)Б)—зав. імя Мясьнікова, Кейлін (Дзяржбанк)—МРВ, Башкевіч (ЦК КП(б)Б) — ДЗ-6, Пятровіч (Гіспарт) — сл. шляху, Дзяшок (рэд. «Зьвязды»)—Саюзтэрмо, Альшэровіч (Дзяржцэлян)—трамвайн, Пяэбург (ЦК КП(б)Б)—Белдзяржбуд, Бэр (рэд. «Аддзібр»)—Мэнбуд, Галаміцкі (ЦВК)—Менедзэрэл, Белбудпанторы, Мэеровіч (с.-г. школа) — Вадаканалтрэст, Арлоўская—Дом ураду, Горфінсэль (Гіспарт)—цэнтр. майст. Белбуду, Клюс (ЦВК)—Энергабуд, Сьвярдлоў (ЦСПСВ) — перша трупком будаўн., Кублінская (Гіспарт)—завод станд. дамоў, Кучіна (рэд. Раб. і калг.)—цагельня № 1, Шакінка (ВДВ) — цагельня 1-я, Чаркоўская (мэдінстытут)—цагельня № 5-6, Скуман (Бімэо)—цагельня № 8, Балотнікаў (Гіспарт)—УНР-6, Гоціяд (Наркасуслік)—УНР-18, Цыпіна («Рабселькор») —УНР-99, Троцкая (Гарапа)—Белкамунбуд, Нускальтэр (НКЮ)—Белбудмэтарс, Шустэр (НКПраны)—Абкамтрэст, Лібо (ЦП саюзу гр. харч.)—друкком хатн. раб., Фрыдман (ОНК)—Дом Чырвонай арміі, Барэйн (ДПУ)—партком міліцыі, Кантаровіч Е. (ЦСПСВ)—Гаркамсаюз, Лозкачнікаў (БДВ)—цагельня № 3.

Рэзэрв

Суханава—ЦКК, Фрайман—НКЗ, Сідаліна—НКЗ, Файнберг—НКЮ, Верхбовіч—«Рабселькор», Шчатін—ГК КСМ, Кудрасў—ГОПС, Варзвая—Гарэма, Кульбак—Наркамлёгпрам, Раманаў—АБВШ, Пугачоў—Гіспарт, Ермакоў—БДУ, Дубраўіцкі—БДВ, Файнгауз—ЦК КП(б)Б, Розэнгаўз — Камунбанк, Герчакоў—ГК КП(б)Б.

Сакрэтарыі ячэйкі выключаюць сваіх дакладчыкаў. Сакратаром партсалектыву і ячэйкам КП(б)Б трэба дагаварыцца з дакладчыкамі аб месцы і часе дакладаў.

Менгарком КП(б)Б.

— Менгарком ЛКСМБ і Менгарсавет ТПТЭ скліканць сёньня 28-II-33 г., у 6 гадз. 30 мін. у клюбе маладзіны (Рэвалюцыйная № 2) канферэнцыю па практыку па пытаньнях: 1. Удзел турыстаў у веснавым сэве. 2. Арг. пытаньні і конкурсу. Прапануецца пад'ехаць сакратароў ячэек калгасаў і старшынь ячэек ТПТЭ заблаговрэмэнна ўзяць.

Нарада сакратароў савецкіх ячэек адбудзецца сёньня, 28 лютага, у 6 гадз. вечара, у залі пасяджэньняў гаркому КП(б)Б. У парадку дня—даклад сакратара гаркому аб задачах работы савецкіх ячэек. На нараду выклікаюцца сакратары ячэек і кіраўнікі гарпалатаў і ўстаноў.

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ—1)

СЁНЬНЯ Кузьма чорны

БАЦЬКАЎШЧЫНА

Эпопея ў 4-х дзеях.

Пачатак у 8 гадзін вечара. Білеты ў раб. касе і касе тэатру.

Чырвоная зорка — Інка ад 1 г. дня — Гукавы фільм вытв. Белдзяржкіно **Першы ўзвод**

Кіно ПРАЛЕТАРЫ — Мастацкі фільм **Зьмеінае джала** Драма ў 6 частк. Дзённы дзіцячы сэансы **Асобная Далёка-Ўсходняя**

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ — Каса—ад 12 г. дня — Мастацкі фільм **ДЗЯРЖАЎНЫ ЧЫНОЎНІК**

СПАРТАК — Каса—з 1 г. дня — Мастацкі фільм **Каўкаскі нявольнік** Драма ў 6 частках.

Трамвайны Трэст Гарсавету

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА, ш т о

з 5 сакавіка 1933 г.

аплата за праезд у трамваі

ЎСТАНАЎЛЯЕЦЦА

15 кап.

Дырэктар Трамвайнага Трэсту Менгарсавету Шкаравіч.

АДКРЫЦЬЦЕ 1, 2, 3 сакавіка — ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРАЙСКІ ТЭАТР (Валадарская, 7) — АДКРЫЦЬЦЕ 1, 2, 3 сакавіка

МЮЗІК-ХОЛ

гастролі ТЭА-ДЖАЗА

БАРЫСА РЭНСКАГА

Штодзённа 2 выступленьні. Пачатак 1-га ў 3 г., 2-га ў 10 г.

Білеты ў рабкасе і касе тэатру. Прымаюцца замоўкі на культпаходы.

Дзеці да 16 год не дапускаюцца.

У АДДЗЕЛ АБ'ЯЎ ЗВАНЕЦЕ 7-81 АТС-21-358

У Менскім Доме Чырвонай арміі сёньня 28 лютага адбудзецца

ВЕЧАР

сустрэчы начскладу з навуковымі работнікамі.

Пачатак у 20 гадз.

Уваход толькі па запрашальных білетах ДЧА.

Мен. ДЧА. Бел. Акадэмія Навук. Дом вучоных.

Дом КАМАСЬВЕТЫ імя К. Маркса

просіць кніга-трымальнікаў з бібліятэкі дому зьвярнуць кнігі у 10-дзённы тэрмін.

Незданыя кнігі будуць спагнаныя і трымальнікі будуць пазбаўлены права на атрыманьне кніг.

Бібліятэка адкрыта з 5 да 8 гадз. вечара штодзённа. Уваход з вул. Энгельса.

Дом камасьветы.

З 1-га сакавіка 1933 г. працуе

першы ў БССР

дзіцячы гукавы кіно-тэатр.

НА ЭКРАНЕ ПАТРОЕНАЯ ПРАГРАМА.

1. Парад глісараў (гукавы фільм)
2. Тэмпы рашаюць (гукавы фільм)
3. Заўжды гатовы (нямы дз. фільм).

Пачатак 1-га сэансу ў 11 г. раніцы.

Каса адкрыта з 10 гадз. раніцы.

Прымаюцца замоўкі на мэтавыя сэансы са скідкай 20 проц.

МЕНДЗЯРЖКІНО.

Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі — Сэктар кнігагандлю

ВЫШАЎ з друку, рассылаецца падпісчыкам і прадаецца ва ўсіх кнігарнях і газэтных кіёсках.

„ЗАКЛІК" № 1 (1933 г.)

новая штомесячная масавая літаратурна-мастацкая часопісь Органа Аргкамітэту Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў БСС